ВОДЗЫЎ АФІЦЫЙНАГА АПАНЕНТА

аб дысертацыі Панова Сяргея Веніямінавіча
«Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь»,
прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені доктара педагагічных навук
па спецыяльнасці13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя
педагогікі і адукацыі

Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны, са спасылкай на вобласць даследавання пашпарта адпаведнай спецыяльнасці, зацверджанага ВАК

Дысертацыя Панова С. В. «Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» адпавядае спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі і галіне навук – педагагічныя ў адпаведнасці з пашпартам спецыяльнасці, зацверджаным загадам ВАК Рэспублікі Беларусь ад 23.10.2018 № 245. Згодна з пашпартам спецыяльнасці такая галіна даследаванняў, як гісторыя педагогікі і адукацыі, змяшчае ў сабе аналіз гістарычнага развіцця інстытуцыялізаванай практыкі адукацыі, дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі і яе нарматыўна-прававога рэгулявання, што адлюстравана ў змесце дысертацыі праз яе стуктуру і змест. У главах 2 і 3 дысертацыі школьная гістарычная адукацыя характарызуецца як інстытуцыянальна-ведамасная сістэма і сацыягуманітарная з'ява, у тым ліку праз адлюстраванне дзяржаўнай гістарычнай палітыкі ў галіне школьнай гістарычнай адукацыі.

Дысертацыйнае даследаванне Панова С. В. па сваёй сутнасці з'яўляецца гісторыка-педагагічным і адпавядае гісторыі адукацыі. Размежаванне са смежнай спецыяльнасцю 13.00.02 – тэорыя і методыка навучання і выхавання (па галінах і ўзроўнях адукацыі) згодна яе пашпарту, зацверджанаму загадам ВАК Рэспублікі Беларусь ад 23.04.2017 № 92, прадугледжвае, што характарыстыка змен у мэтах навучання ў адпаведнасці з сучаснымі сацыякультурнымі і эканамічнымі зменамі ў развіцці грамадства, распрацоўка канцэпцый зместу вучэбных прадметаў на розных узроўнях адукацыі, распрацоўка дзяржаўных адукацыйных стандартаў з'яўляюцца адной з перадумоў для вызначэння тэндэнцый і перспектыў развіцця школьнай гістарычнай адукацыі.

Актуальнасць тэмы дысертацыі

Актуальнасць тэмы дысертацыі абумоўлена мэтазгоднасцю гісторыка-педагагічнай рэфлексіі вынікаў працэсу станаўлення ў Рэспубліцы Беларусь школьнай гістарычнай адукацыі, што неабходна для выяўлення яе тэндэнцый і вызначэння перспектыў развіцця ва ўмовах рэалізацыі

дзяржаўнай гістарычнай палітыкі і сучасных міжпакаленных практык камунікацыі.

Вызначэнне і абгрунтаванне канцэптуальных асноў школьнай гістарычнай адукацыі на аснове абагульнення і сістэматызацыі вопыту яе развіцця як інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы актуальна для мадэрнізацыі яе структуры, зместу, функцыяналу.

Вызначэнне і абгрунтаванне канцэптуальных асноў школьнай гістарычнай адукацыі як сацыягуманітарнай з'явы актуалізавана фарміраваннем нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці вучняў, іх грамадзянскасці пры вызначэнні агульнанацыянальнай ідэі як светапоглядной асновы школьнай гістарычнай адукацыі і прыняцці вучнямі каштоўнасці дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.

Распрацоўка з удзелам саіскальніка сацыяльна-педагагічнай мадэлі патрыятычнага выхавання вучнёўскай моладзі, прадстаўленая ў дысертацыйным даследаванні, актуальна ва ўмовах ажыццяўлення Праграмы патрыятычнага выхавання насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2022–2025 гг. і рэалізацыі светапоглядна-выхаваўчай функцыі школьнай гістарычнай адукацыі.

Ступень навізны вынікаў дысертацыі і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону

Упершыню школьная гістарычная адукацыя пазіцыяніруецца як комплексная педагагічная сістэма на I, II, III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі: прапедэўтычнае навучанне на першым канцэнтры ў пачатковай школе, вучэбны прадмет «Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь» у IV класе; сістэмнае падзейна-храналагічнае вывучэнне сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі на другім канцэнтры ў базавай школе; праблемна-тэарэтычнае навучанне на трэцім канцэнтры ў выпускных класах з улікам распрацоўкі інтэграванага курса гісторыі Беларусі ў кантэксце сусветнай.

Упершыню ў тэорыі і практыцы школьнай гістарычнай адукацыі яе канцэптуальныя асновы абгрунтаваны комплексна як інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы і як сацыягуманітарнай з'явы. Прынцыпова новыя вынікі даследавання школьнай гістарычнай адукацыі як сацыягуманітарнай з'явы канцэптуалізаваны праз міждысцыплінарныя канцэпты гістарычнай памяці, нацыі і нацыянальнай ідэі, нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, беларускай дзяржаўнасці, традыцыйных каштоўнасцей сучаснага беларускага грамадства. Саіскальнікам упершыню сістэмна вывучана іх тэарэтычная характарыстыка прадстаўнікамі сучаснага беларускага навукова-педагагічнага супольніцтва і рэалізацыя ў змесце школьнай гістарычнай адукацыі.

Упершыню ўдакладнены і канкрэтызаваны канцэптуальна-метадалагічны, інстытуцыянальна-функцыянальны, зместава-дзейнасны, сацыяльна-аксіялагічны кампанеты школьнай гістарычнай адукацыі з улікам адпаведных ім фактараў: нарматыўна-прававая распрацоўка канцэптуальных асноў школьнай гістарычнай адукацыі ў трох пакаленнях канцэпцый; афармленне дзяржаўнай гістарычнай палітыкі ў галіне школьнай гістарычнай адукацыі; рэалізацыя нацыястваральнага патэнцыялу гісторыі Беларусі; трансляцыя зместу адукацыі як сацыяльнага вопыту пры забеспячэнні пераемнасці гістарычнай памяці і сістэмы традыцыйных каштоўнасцей.

Упершыню сканструявана шматкампанентная і шматфактарная структурна-зместавая мадэль вывучэння працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі, якая з'яўляецца ўніверсальным інструментам гісторыка-педагагічнага даследавання.

Упершыню на сістэматызаванай аснове распрацавана чатырохэтапная перыядызацыя працэсу развіцця ў Рэспубліцы Беларусь школьнай гістарычнай адукацыі, якая ўлічвае: вызначэнне яе канцэптуальных асноў у канцэпцыях 1991, 2009, 2022 гг.; стандартызацыю ў трох пакаленнях адукацыйных стандартаў 1998, 2009, 2018 гг.; структураванне зместу адукацыі па канцэнтрычным і лінейным прынцыпах; канструяванне зместу ў пяці пакаленнях школьнай вучэбнай гістарычнай літаратуры; рэалізацыю культуралагічнага і кампетэнтнаснага падыходаў у іх пераемнасці; ажыццяўленне дзяржаўнай гістарычнай палітыкі.

Упершыню комплексна выяўлены тэндэнцыі развіцця школьнай гістарычнай адукацыі, якія сведчаць аб зменах у канцэптуальным мэтавызначэнні, пераемнасці прынцыпаў абнаўлення зместу, цыклічнасці ў структураванні зместу, паступовым абнаўленні функцыяналу.

Упершыню комплексна выяўлены тэндэнцыі развіцця школьнай гістарычнай адукацыі, якія арыентаваны на рэалізацыю нацыястваральнага патэнцыялу вучэбнага прадмета «Гісторыя Беларусі», ажыццяўленне грамадзянска-патрыятычнага выхавання, удакладненне прынцыпаў адбору зместу, інтэграцыю гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі.

Абгрунтаванасць і дакладнасць высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі

Абгрунтаванасць і дакладнасць высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі як гісторыка-педагагічным даследаванні, абумоўлена яго метадалагічнай асновай, якая на філасофскім узроўні ўлічвае прынцыпы гістарызму, спалучэння гістарычнай рэстраспектывы з перспектывай развіцця, дыялектычнай прыроды пазнання школьнай гістарычнай адукацыі як комплекснай педагагічнай сістэмы ва ўзаемадзеянні яе кампанентаў і дэтэрмінуючых фактараў.

Абгрунтаванасць і дакладнасць высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі, забяспечваюцца міжідысцыплінарным характарам гісторыка-педагагічнага даследавання, якое ўлічвае метадалагічныя асаблівасці гісторыі адукацыі як галіны педагагічнай навукі і метадалагічныя прынцыпы гістарычнага пазнання як галіны гістарычнай навукі. На агульнанавуковым узроўні ў дысертацыі ўжываюцца: міждысцыплінарныя канцэпты акадэмічнай гісторыі (беларуская дзяржаўнасць, гістарычная памяць), паліталогіі (дзяржаўнасць, нацыя і нацыянальная ідэя), сацыялогіі (гістарычная памяць, нацыянальна-культурная ідэнтычнасць, традыцыйныя каштоўнасці сучаснага беларускага грамадства).

Абгрунтаванасць і дакладнасць высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі, абумоўлена вынікамі 13 навукова-даследчых работ з удзелам саіскальніка, а таксама практыка-арыентаваным выкарыстаннем вынікаў даследавання ў інстытутах развіцця адукацыі на курсах павышэння кваліфікацыі настаўнікаў гісторыі, што падцвярджаецца 8 актамі аб практычным выкарыстанні.

Абгрунтаванасць і дакладнасць высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі, забяспечваюцца таксама выкарыстаннем разнастайных крыніц, сярод якіх фонды Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, тры пакаленні канцэпцый і адукацыйных стандартаў, пяць пакаленняў школьнай вучэбнай літаратуры па сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі.

Абгрунтаванасць і дакладнасць высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі, сваёй асновай мае рэфлексію саіскальнікам удзелу як сааўтара ў распрацоўцы Канцэпцыі «Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі» 2009 г., Канцэпцыі школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь 2022 г. (падцвярджаецца даведкай Акадэміі адукацыі), у стварэнні аднаго падручніка і 19 вучэбных дапаможнікаў па вучэбных прадметах «Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь», «Сусветная гісторыя», «Гісторыя Беларусі» з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (падцвярджаецца актам Нацыянальнага інстытута адукацыі аб укараненні вынікаў дысертацыйнага даследавання).

Навуковая, практычная, эканамічная і сацыяльная значнасць вынікаў з указаннем рэкамендацый па іх выкарыстанню

Навуковая значнасць дысертацыйнага даследавання як гісторыка-педагагічнага пры вывучэнні рэтраспектывы і перспектыў развіцця ў Рэспубліцы Беларусь школьнай гістарычнай адукацыі заключаецца ў яго міждысцыплінарнасці, што выяўляецца праз сістэматызацыю рэалізуемых у адукацыйным асяроддзі агульнапедагагічных, акадэмічна-гістарычных,

прадметна-гістарычных падыходаў, выкарыстанне гістарычных, сацыялагічных, паліталагічных канцэптаў пры пазіцыяніраванні школьнай гістарычнай адукацыі як комплекснай педагагічнай сістэмы, што мае інстытуцыянальна-ведамасны характар і сацыягуманітарную сутнасць.

Навуковая значнасць дысертацыйнага даследавання як гісторыка-педагагічнага таксама характарызуецца ўдакладненнем комплексу прынцыпаў адбору зместу школьнай гістарычнай адукацыі, якія звязаны з актуалізацыяй дзейнаснага, эмацыянальна-каштоўнаснага кампанентаў зместу школьнай гістарычнай адукацыі, у тым ліку прадстаўленнем метадалагічных ведаў на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі; далейшай распрацоўкай зместавых ліній з улікам іх міжпрадметнасці; улікам каштоўнасных арыентацый вучняў; пераадоленнем празмернай факталагічнасці; інтэграцыяй зместу гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі.

Практычная значнасць вынікаў дысертацыйнага даследавання заключаецца ў магчымасці іх выкарыстання пры навукова-метадычным забеспячэнні дзяржаўнай гістарычнай палітыкі ў гуманітарна-грамадазнаўчай сферы, стварэнні і правядзенні вопытнай праверкі вучэбнай літаратуры па гісторыі, у працэсе павышэння кваліфікацыі і паслядыпломной падрыхтоўкі настаўнікаў гісторыі, пры фарміраванні функцыянальнай адукаванасці вучняў.

Эканамічная значнасць вынікаў дысертацыі звязана з працэсам школьнага вучэбнага кнігавыдання, які абумоўлены падрыхтоўкай новага пакалення школьнай вучэбнай гістарычнай літаратуры, у прыватнасці, па вучэбным прадмеце «Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь», а таксама інтэграванага курса гісторыі Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі.

Сацыяльная значнасць вынікаў дысертацыі заключаецца ў магчымасці іх выкарыстання ў працэсе фарміравання ў вучняў гістарычнай памяці і нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці як інтэграваных характарыстык асобы, прыняцці вучнямі каштоўнасці дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь і сістэмы традыцыйных каштоўнасцей беларускага народа як рэгулятараў сацыяльных паводзін.

Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку

Вынікі даследавання знайшлі адлюстраванне ў 83 публікацыях, з іх 32 – адпавядаюць патрабаванням пункта 19 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь: 1 манаграфія, 31 артыкул (з іх 2 – у суаўтарстве) у выданнях, уключаных у пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў, у тым ліку 4 артыкулы ў навуковых выданнях ВАК Расійскай Федэрацыі. Іншыя публікацыі, якія пацвярджаюць практычную значнасць дысертацыйнага даследавання: 9 артыкулаў (з іх 2 – у

суаўтарстве) у іншых выданнях; 1 артыкул у калектыўнай манаграфіі; 6 артыкулаў у зборніках навуковых прац; 28 артыкулаў у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый, у т.л. замежных (Расія, Малдова, Украіна); адзін навукова-метадычны дапаможнік, 3 вучэбныя дапаможнікі (у суаўтарстве) з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, 3 вучэбна-метадычныя дапаможнікі з грыфам Нацыянальнага інстытута адукацыі. Агульны аб'ём публікацый па тэме дысертацыі складае 60,07 аўт. арк. Аб'ём аднаасобна апублікаваных саіскальнікам работ складае 38,70 аўт. арк.

Адпаведнасць афармлення дысертацыі патрабаванням ВАК

Дысертацыя адпавядае патрабаванням Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь. У працы прыводзяцца спасылкі з указаннем аўтараў і крыніц, матэрыялы якіх выкарыстоўваюцца ў дысертацыі, а таксама спасылкі на ўласныя публікацыі, у якіх змяшчаюцца матэрыялы дысертацыйнага даследавання.

Афармленне дысертацыі і аўтарэферата адпавядае патрабаванням «Інструкцыі аб парадку афармлення кваліфікацыйнай навуковай работы (дысертацыі) на атрыманне вучоных ступеняў кандыдата і доктара навук, аўтарэферата і публікацый па тэме дысертацыі», зацверджанай Пастановай Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь № 5 ад 22 жніўня 2022 г.

Заўвагі па дысертацыі (пры іх наяўнасці), калі яны не паказваюцца ў структурных элементах водзыва аб дысертацыі

Адзначаючы належную навуковую кваліфікацыю саіскальніка, лічым магчымым выказаць некаторыя пажаданні і пытанні дысертанту, якія не зніжаюць вартасцей працы:

1. Пры вывучэнні саіскальнікам працэсу станаўлення ў Рэспубліцы Беларусь школьнай гістарычнай адукацыі, пачынаючы з 1991 г., бачыцца мэтазгодным абазначыць яе пераемнасць з развіццём школьнай гістарычнай адукацыі ў савецкі перыяд з пункту гледжання больш выразнай характарыстыкі прынцыпаў абнаўлення зместу, занатаваных у Канцэпцыі гістарычнай адукацыі ў сярэдняй школе Беларусі 1991 г.

2. На стар. 20 дысертацыі культуралагічны падыход аднесены да агульнанавуковага ўзроўню метадалогіі гісторыка-педагагічнага даследавання школьнай гістарычнай адукацыі, а ў высновах па першым раздзеле на стар. 63 ён характарызуецца як агульнапедагагічны. Ці няма тут супярэчнасці?

На стар. 63 аўтар сцвярджае, што агульнапедагагічныя падыходы "(культуралагічны і кампетэнтнасны ў іх пераемнасці) як комплексныя педагагічныя сродкі ўлічваюць вопыт рэалізацыі і прагнастычны патэнцыял культуралагічнага падыходу для забеспячэння пераемнасці з

кампетэнтнасным пры фарміраванні ў вучняў вопыту творчай дзейнасці і эмацыянальна-каштоўнаснага стаўлення да падзей, што вывучаюцца, і іх удзельнікаў з улікам такіх універсальных кампетэнцый, як крэатыўнасць і эмацыянальная рэгуляцыя". Гэта значыць, па сутнасці, культуралагічны падыход улічвае вопыт рэалізацыі гэтага ж падыходу (самога сябе). Ці няма тут лагічнай памылкі?

3. Характарызуючы спецыфіку гістарычнага даследавання, аўтар выкарыстоўвае дзейнасны падыход на агульнанавуковым узроўні метадалогіі і кампетэнтнасны падыход на канкрэтна-навуковым узроўні. З нашага пункту гледжання, дзейнасны і кампетэнтнасны падыходы ўзаемаперакрываюць адзін аднаго, лепш выкарыстоўваць адзін падыход (або дзейнасны, або кампетэнтнасны). Тым больш, на нашу думку, яны знаходзяцца на адным узроўні метадалогіі педагогікі, канкрэтна-навуковым. Акрамя таго, аўтар выкарыстоўвае дзейнасны падыход пры актуалізацыі ўніверсальных кампетэнцый... (стар. 20), што бліжэй да трактоўкі кампетэнтнаснага падыходу.

4. У тэксце дысертацыі саіскальнікам неаднаразова на сс. 40, 69, 129, 172 згадваецца інфармацыя аб каштоўнасных арыентацыях вучняў IX, XI класаў, вызначаных Нацыянальным інстытутам адукацыі ў 2014/2015 навучальным годзе па выніках рэспубліканскага маніторынгу асобаснага развіцця і ўзроўню выхаванасці (сям'я, здароўе, сяброўства, адукацыя, любоў, прыстойнасць, паспяховая кар'ера, свабода асобы, любоў да Радзімы, цікавая работа, вера ў Бога, дабрабыт). Тое ж самае тычыцца пераліку традыцыйных каштоўнасцей, вызначаных у 2021 г. Цэнтрам сацыялагічных і палітычных даследаванняў Белдзяржуніверсітэта (сям'я, сябры і знаёмыя, вольны час, палітыка, работа, рэлігія). Узнікае пытанне аб мэтазгоднасці такіх літаральных паўтораў у змесце дысертацыі.

5. Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі грунтуецца на яе акадэмічна-навуковым патэнцыяле, які прадстаўлены, перш за ўсё, гістарычнымі факультэтамі ўстаноў вышэйшай адукацыі. Было б да месца больш выразана абазначыць у дысертацыі ўклад беларускіх вучоных-гісторыкаў – прадстаўнікоў гістарычных факультэтаў вядучых устаноў вышэйшай адукацыі ў навукова-тэарэтычнае забеспячэнне працэсу станаўлення і развіцця нацыянальнай сістэмы школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

Названыя заўвагі маюць рэкамендацыйны характар, не ўплываюць на тэарэтычныя і практычныя вынікі дысертацыйнага даследавання і могуць быць улічаны саіскальнікам у дакладзе, які прадстаўляецца пры абароне.

Адпаведнасць (неадпаведнасць) навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе

Дысертацыя Панова С. В. «Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» з'яўляецца самастойным завершаным арыгінальным гісторыка-педагагічным даследаваннем, якое сведчыць аб асабістым укладзе аўтара ў тэорыю і практыку школьнай гістарычнай адукацыі. Навуковая кваліфікацыя Панова С. В. адпавядае вучонай ступені доктара педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі і галіне навук – педагагічныя.

Навуковыя вынікі, за якія саіскальніку можа быць прысуджана вучоная ступень

Дысертацыя Панова Сяргея Веніямінавіча «Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь», прадстаўленая на атрыманне вучонай ступені доктара педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі, адпавядае крытэрыям навуковай і практычнай значнасці, утрымлівае сукупнасць навуковых вынікаў, якія з'яўляюцца інтэгральнай характарыстыкай навізны праведзенага даследавання.

Экспертыза дысертацыі, аўтарэферата, публікацый па тэме дысертацыі, матэрыялаў, якія падцвярджаюць практычную рэалізацыю атрыманых вынікаў у адукацыйным працэсе, дазваляе зрабіць выснову аб тым, што вучоная ступень доктара педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі можа быць прысуджана Панову С. В. за:

– удакладненне структурных кампанентаў школьнай гістарычнай адукацыі як комплекснай педагагічнай сістэмы (канцэптуальна-метадалагічны; інстытуцыйна-функцыянальны; зместава-дзейнасны; сацыяльна-аксіялагічны) і іх характарыстыку ў адпаведнасці з вызначанымі дэтэрмінуючымі фактарамі (нарматыўна-прававая распрацоўка канцэптуальных асноў школьнай гістарычнай адукацыі; дзяржаўная гістарычная палітыка; нацыястваральны аптэнцыял гісторыі Беларусі; змест адукацыі як сацыяльны вопыт, які трансліруецца ва ўмовах сучаснай міжпакаленнай камунікацыі і арыентаваны на забеспячэнне пераемнасці гістарычнай памяці і сістэмы традыцыйных каштоўнасцей);

– сістэматызацыю рэалізуемых у змесце школьнай гістарычнай адукацыі метадалагічных падыходаў: акадэмічна-гістарычныя (фармацыйны, мадэрнізацыйны, цывілізацыйны); прадметна-гістарычныя (гісторыка-крыніцазнаўчы, гісторыка-антрапалагічны, гісторыка-аксіялагічны); агульнапедагагічныя (культуралагічны і кампетэнтнасны ў іх пераемнасці);

– канструяванне мадэлі вывучэння працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі, якая мае ўніверсальны характар для даследавання комплексных педагагічных сістэм у складзе канцэптуальна-метадалагічнага, інстытуцыйна-функцыянальнага, зместава-дзейнаснага, сацыяльна-аксіялагічнага кампанентаў;

– вызначэнне комплексу рэпрэзентатыўных працэсаў (афармленне канцэптуальных асноў у трох пакаленнях канцэпцый 1991, 2009, 2022 гг.; стандартызацыя ў трох пакаленнях адукацыйных стандартаў 1998, 2009, 2018 гг.; канструяванне зместу пяці пакаленняў школьнай вучэбнай гістарычнай літаратуры; рэалізацыя культуралагічнага і кампетэнтнаснага падыходаў у іх пераемнасці; станаўленне дзяржаўнай гістарычнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь) для распрацоўкі перыядызацыі развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь у складзе чатырох этапаў (канцэптуальна-вызначальны, 1991–1997), метадычна-стваральны, 1998–2008), канцэптуальна-прадметны, 2009–2014), кампетэнтнасна-арыентаваны, 2015–2022);

– выяўленне тэндэнцый развіцця школьнай гістарычнай адукацыі: эвалюцыя канцэптуальнага мэтавызначэння ад захавання вузкапрадметнасці да арыентаванасці на фарміраванне гістарычнай памяці і нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці асобы вучня; забяспечэнне кансалідуючай функцыі адукацыі адносна ролі гістарычнай памяці; актуалізацыя дзейнасна-паводзінскай функцыі для выбару вучнямі ў якасці маральных арыенціраў канкрэтна-гістарычных аналагаў паводзін чалавека ў гісторыі; пераемнасць у абнаўленні зместу прынцыпаў антрапалагізацыі (вывучэнне ролі чалавечага фактару ў гісторыі), культурна-гістарычнага асяроддзя (трансляцыя дасягненняў ў галіне матэрыяльнай і духоўнай культуры, ідэй і каштоўнасных арыентацый чалавека), гістарычнай дыялагічнасці (камунікацыя вучняў з аддаленымі ад перыяду іх жыцця аб'ектамі вывучэння), філасофскага абагульнення і дыялагічнай інтэрпрэтацыі гістарычных фактаў; цыклічнасць у рэалізацыі канцэнтрычнага і лінейнага прынцыпаў структуравання зместу;

– канцэптуалізацыю даследавання праз характарыстыку тэарэтычна вызначаных прадстаўнікамі сучаснага навукова-педагагічнага супольніцтва Беларусі міждысцыплінарных канцэптаў гістарычнай памяці, нацыі і нацыянальнай ідэі, нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, беларускай дзяржаўнасці, традыцыйных каштоўнасцей сучаснага беларускага грамадства;

– канкрэтызацыю перспектыў развіцця школьнай гістарычнай адукацыі: рэалізацыя нацыястваральнага патэнцыялу гісторыі Беларусі праз канструяванне нацыянальна-культурнага і сацыяльна-аксіялагічнага зместу

адукацыі; рэалізацыя светапоглядна-выхаваўчай ролі адукацыі пры ажыццяўленні сацыяльна-педагагічнай мадэлі патрыятычнага выхавання вучнёўскай моладзі; удакладненне прынцыпаў адбору зместу, арыентаваных на мэтавызначэнне, ажыццяўленне акадэмічна-гістарычных і прадметна-гістарычных падыходаў, распрацоўку зместавых ліній, улік каштоўнасных арыентацый вучняў, пераадоленне празмернай факталагічнасці зместу, міжпрадметную інтэграцыю зместу гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі.

Загадчык кафедры педагогікі
ўстановы адукацыі
«Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова»,
доктар педагагічных навук, прафесар А. І. Снапкова

Подпись А. И. Снапковой
заверяю
отдела кадров
учреждения образования
«Могилёвский государственный
университет имени А.А. Кулешова»

ОТДЕЛ КАДРОВ